## Вынікі тыдня беларускай мовы і літаратуры

З 19 па 25 лютага 2021 года ў каледжы праходзіў тыдзень беларускай мовы і літаратуры, прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы. Адкрыццё тыдня пачалося 19 лютага акцыяй "Гавары са мной па-беларуску" для навучэнцаў і супрацоўнікаў каледжа. Вядучыя прапаноўвалі перакласці рускія словы на родную мову. Атмасферу свята стварылі прыгожа аформлены стэнд у фае каледжа, а таксама выказванні беларускіх паэтаў і пісьменнікаў аб роднай мове.




















Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!
Матчын дарунак ад самая калыскі,
Ты самацветаў яскравая нізка.

Гэтак цудоўна сказаў пра нашу мову паэт Уладзімір Дубоўка. Без нашай мовы не было б і нас, як нацыі.

22 лютага навучэнцы груп першага курса прынялі ўдзел у конкурсе чытальнікаў вершаў "Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся!", прымеркаванага да Міжнароднага дня роднай мовы. Навучэнцы падрыхтавалі цудоўныя вершы на беларускай мове.

**Лепшымі былі прызнаны:**

1. Тарасюк Златаўласта - навучэнка гр. АГБ-24
2. Саламінскі Юрый - навучэнец гр. ТАР-59
3. Міклаш Міхаіл - навучэнец гр. АЭП-33
4. Шыманіца Аляксандр - навучэнец гр. БСК-44




У гэты ж самы дзень адбылася выстава малюнкаў па творчасці пісьменнікаў-юбіляраў, якія выканалі навучэнцы груп першага курса. **Лепшымі работамі былі прызнаны:**

1. Ілюстрацыя да байкі К.Крапівы “Дыпламаваны баран”, навучэнкі групы АГБ-24 Крывякіна С., Нарэўская В., Сіпач В.

2. Ілюстрацыі да рамана І.Шамякіна “Сэрца на далоні”, навучэнка гр. ПГБ-109 Лідака Т., і навучэнка гр. АГБ-24 Бахар М.

3. Ілюстрацыя да п’есы К.Крапівы “Хто смяецца апошнім”, навучэнка гр. ПЗТ-34 Шалягейка В.






Кураатары груп 1 курса правялі 23 лютага інфармацыйныя гадзіны на тэму "Пісьменнікі-юбіляры", прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння І. Шамякіна і І. Мележа.








Да 100-годдзя з дня нараджэння І.Мележа для навучэнцаў груп БСК-44 і ПЗТ-34 бібліятэкар Фанга Ж.І. і выкладчык Добрук Л.Ф. правялі віктарыну “Жыццё пражыць – не поле перайсці”. Навучэнцы з задавальненнем узнавілі ў памяці звесткі пра жыццё і творчасць аўтара “Палескай хронікі”, паглядзелі эпізоды з вядомага кінафільма “Людзі на балоце”.

24 лютага ў конкурсе творчых пісьмовых работ “За што я люблю сваю Радзіму” навучэнцы каледжа выказалі сваю любоў да свайго роднага кутка.

**Пераможцамі прызнаны:**

1. Кунец Аляксандра, навучэнка гр. ПГБ-109
2. Тарасюк Златаўласта, навучэнка гр. АГБ-24
3. Юзэфовіч Анастасія, навучэнка гр. АГБ-24





**Акцыя «Паспрабуй, перакладзі!»**

*«Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову,*
*але найперш трэба знаць сваю»*
*Ф.Багушэвіч*

З нагоды Міжнароднага дня роднай мовы, 24.02.2021 настаўнікамі замежнай мовы каледжа была праведзена акцыя "Паспрабуй, перакладзі!". Навучэнцы старэйшых курсаў на занятках па дысцыплінах "Замежная мова (прафесійная лексіка)", «Замежная мова дзелавых зносін» перакладалі тэксты прафесійнай накіраванасці з замежнай мовы на беларускую.









**"Трывожнае шчасце Івана Шамякіна"**

25 лютага ў чытальнай зале бібліятэкі корп. №1, для навучэнцаў гр. ПГБ-106, загадчык бібліятэкі Дарошчык С.І. правяла літаратурны агляд па творах Івана Шамякіна, прысвечаны 100-годдзю беларускага пісьменніка.







У чацвер 25 лютага 2021 года навучэнцы каледжа ўшанавалі беларускую мову літаратурна-музычнай вечарынай “Жывое ў вяках беларускае слова”. Вядучыя і ўдзельнікі вечарыны далучылі нас да народнай творчасці – песняў і казак, легендаў і паданняў, прыказак і фразеалагізмаў, загадак і жартаў.



А таксама былі ўзнагароджаны пераможцы тыдня роднай мовы.

Зацікаўленасць, добразычлівасць, атмасфера даверу і вясёлага настрою панавалі на працягу тыдня.















Удзячны ўсім, хто далучыўся да ўдзелу ў тыдні роднай мовы!